# Аляксандр Асаткін і яго кароткая кар’ера ў БССР

УДК 94(47+57)«19»(092)+32(47+57)«19»(092)



**Аляксей ЕЛІСЕЕЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

**Аляксей ЕЛІСЕЕЎ. Аляксандр Асаткін і яго кароткая кар’ера ў БССР.** Артыкул прысвечаны савецкаму дзяржаўнаму і партыйнаму дзеячу Аляксандру Мікалаевічу Асаткіну, удзельніку ўзбуйнення тэрыторыі БССР у 1924 годзе. Прыводзяцца звесткі пра яго працу на пасадах сакратара Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б), адказнага сакратара ЦК КП(б)Б, паказваюцца ўзаемаадносіны палітычнай эліты БССР у сярэдзіне 1920-х гадоў, раскрываецца сутнасць і абставіны канфлікту Асаткіна з нацыянальна арыентаванай часткай кіраўніцтва БССР і КП(б)Б, у выніку якога ён быў адклікаsuccessfully з працы ў БССР.

**Ключавыя словы:** БССР, узбуйненне, Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б), Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі, палітычная эліта.

**Aliaksei YELISEYEU. Aleksandr Asatkin and his short-lived career in the BSSR.** The article is dedicated to the Soviet statesman and party figure Aleksandr Asatkin who took part in the enlargement of the BSSR in 1924. The article tells the readership about his work as secretary of the Interim Belarusian Bureau of the Central Committee of the Russian Communist Party (Bolsheviks), Executive Secretary of the Central Committee of the Communist Party of Belarus (Bolsheviks), the relationship between the political elite of the BSSR in the mid-1920s, the essence and circumstances of Asatkin's run-in with the nationally oriented part of the leadership of the BSSR and the Communist Party of Belarus (Bolsheviks), which resulted in his recalling from the BSSR.

**Keywords:** BSSR, enlargement, Interim Belarusian Bureau of the Central Committee of the Russian Communist Party (Bolsheviks), Communist Party of Belarus (Bolsheviks), political elite.

Імя Аляксандра Мікалаевіча Асаткіна (1885–1937) сёння мала знаёмае шырокай аўдыторыі, але ў свой час ён знаходзіўся ў цэнтры палітычнага жыцця БССР. У лютым 1924 года Асаткін быў прызначаны сакратаром Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б), а ў маі на пасаду адказнага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі яго абраў VIII з’езд КП(б)Б, які замест Часовага бюро стварыў Цэнтральны Камітэт. Такім чынам, Асаткін заняў вышэйшую палітычную пасаду ў рэспубліцы. Праўдападобна, што гэта прызначэнне меркавалася на працяглы



## ПРА АЎТАРА

ЕЛІСЕЕЎ Аляксей Барысавіч.

Нарадзіўся ў 1983 годзе ў г. Баранавічы Брэсцкай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2006), аспірантуру Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ (2009).

У 2006–2007 гадах працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства Косінскай СШ Лагойскага раёна Мінскай вобласці. З 2007 па 2009 год – начальнік аддзела грамадскага аб’яднання садзейнічання беларуска-расійскай інтэграцыі «Разам». З 2009 года – у сістэме вышэйшай адукацыі краіны: старшы выкладчык, дацэнт кафедры гуманітарных навук, дэкан Мінскага філіяла Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі. З 2015 года – намеснік дырэктара, з 2018 года – дырэктар Мінскага філіяла Расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя Г.В. Пляханава.

Кандыдат гістарычных навук (2010), дацэнт (2020).

Аўтар больш як 60 навуковых прац і публікацый, у тым ліку адной манаграфіі.

Сфера навуковых інтарэсаў: гістарыяграфія, палітычная і сацыяльная гісторыя БССР і СССР.

час, але ў верасні 1924 года Асаткіна адклікалі. Яго непрацяглую кар'еру разбурыў адкрыты канфлікт з нацыянальна арыентаванай часткай кіраўніцтва БССР і КП(б)Б, а ЦК і ЦКК РКП(б) сталі пры гэтым на бок беларускіх кіраўнікоў.



**Аляксандр Асаткін. 1907 год**

## Да БССР

Аляксандр Мікалаевіч Асаткін (да свайго прозвішча ён дадаваў псеўданім Уладзімірскі) нарадзіўся 15 кастрычніка 1885 года ў сяле Вазнясенскае Бычыхінскай воласці Кастрамской губерні. Сын царкоўнага дзяка, ён далучыўся да сацыял-дэмакратычнага руху падчас вучобы ў Кастрамской духоўнай семінарыі, якую не скончыў, бо ў 1904 годзе яго арыштавалі. Пасля бралі пад варту яшчэ чатыры разы, больш за два з паловай гады правёў у адзіночцы. Паводле яго ўспамінаў, каля шасці месяцаў сядзеў у ёй «у найстражэйшай ізаляцыі: без шпацыраў, без лазні, без грошай і перадач» *[1, арк. 17]*. Тры разы Асаткіна высылалі ў Нарымскі край, дзе агульным тэрмінам ён правёў чатыры гады. Усё гэта здарылася з ім ва ўзросце ад 19 да 26 гадоў. У 1912 годзе Асаткін нарэшце апынуўся на свабодзе, прыехаў у Маскву і паступіў вольным слухачом у Маскоўскі камерцыйны інстытут (цяпер Расійскі эканамічны ўніверсітэт імя Г.В. Пляханава). У 1914 годзе быў мабілізаваны і накіраваны санітарам у санітарна-медыцынскія ўстановы Усерасійскага Земскага саюза. На гэтай службе сустракаўся з іншымі працаўнікамі саюза: Барысам Позернам, Ісідарам Любімавым і Карлам Ландэрам, якія ў 1917 годзе паслядоўна будуць узначальваць Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў *[1, арк. 18]*.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 года застала Асаткіна ў Адэсе, дзе ён удзельнічаў у стварэнні Адэскага Савета рабочых дэпутатаў. У маі Асаткін прыехаў у Маскву, але хутка накіраваўся ў Іванава-Вазнясенск, дзе стаў адным з лідараў прафесійнага саюза тэкстыльшчыкаў, арганізатарам стачкі тэкстыльшчыкаў, якая ахапіла не толькі Іванава-Вазнясенскую, але і некаторыя часткі Кастрамской і Уладзімірскай губерняў. Кастрычніцкая рэвалюцыя застала яго ўжо на чале Іванава-Вазнясенскай гарадской думы *[1, арк. 11]*. На працягу 1918–1920 гадоў дзейнасць Асаткіна была звязана выключна з арганізацыяй тэкстыльнай прамысловасці. З гэтай прычыны ён перабраўся ў Ташкент, дзе хутка быў прызначаны старшынёй Савета народнай гаспадаркі і намеснікам старшыні Савета народных камісараў Туркестанскай АССР. У Туркестане прабыў да красавіка 1922 года, калі быў адкліканы ў Маскву. Працаваў адказным інструктарам ЦК РКП(б), пакуль у ліпені 1923 года яго не напаткала новае прызначэнне – старшынёй створанай пры ЦК РКП(б) камісіі па змяненню межаў БССР.

## Узбуйненне тэрыторыі БССР

Пытанне аб вяртанні ў склад БССР усходніх тэрыторый паўстала ў верасні 1922 года падчас абмеркавання ўзаемаадносін паміж РСФСР і савецкімі рэспублікамі з нагоды меркаванага ўтварэння СССР. А 16 верасня 1922 года Цэнтральнае Бюро КП(б)Б пастанавіла ўзняць пытанне аб тэрыторыі Беларусі, кіруючыся мэтазгоднасцю далучэння да БССР Віцебскай і Гомельскай губерняў *[2, с. 197]*. У чэрвені 1923 года ад імя Цэнтральнага Бюро КП(б)Б на адрас ЦК РКП(б) была накіравана дакладная запіска з матывамі ўзбуйнення і акрэсленымі новымі межамі рэспублікі. А 12 ліпеня Палітбюро ЦК РКП(б) прызнала ўзбуйненне тэрыторыі БССР прын-

цыпова неабходным і з мэтай усебаковага вывучэння гэтага пытання, вызначэння тэрыторыі БССР з улікам яе пашырэння даручыла Арганізацыйнаму бюро ЦК стварыць спецыяльную камісію. Менавіта гэту камісію і ўзначаліў А. Асаткін.

На пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) 29 лістапада 1923 года ён зрабіў даклад «Аб межах Беларусі» *[3, с. 210–211]*. Ад імя камісіі Асаткін прапанаваў далучыць да БССР усю Віцебскую губерню, два паветы Смаленскай і восем паветаў Гомельскай губерняў. Палітбюро зацвердзіла гэту прапанову і даручыла Прэзідыуму ЦВК СССР у месячны тэрмін прыняць адпаведную пастанову. Як вядома, гэта рашэнне было потым скарэктавана не на карысць БССР і шэраг тэрыторый былі пакінуты ў складзе РСФСР, але большасць усё ж была далучана да рэспублікі.

Калі Прэзідыум ЦВК СССР прыняў пастанову аб узбуйненні тэрыторыі Беларускай ССР (4 лютага 1924 года), Палітбюро ЦК РКП(б) для кіраўніцтва партыйнымі справамі ва ўзбуйненай рэспубліцы стварыла Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б), сакратаром якога быў прызначаны Асаткін. На пасяджэнні ЦБ КП(б)Б 8 лютага Асаткін праінфармаваў пра гэта рашэнне, пасля чаго ЦБ пастанавіла лічыць сваю дзейнасць спыненай *[4, арк. 27 адв]*.

## Умацаванне пазіцый

Першае пасяджэнне Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б) Асаткін правёў 9–10 лютага 1924 года. Па ўзоры Часовага бюро ЦК да часу, пакуль усе пытанні, выкліканыя неабходнасцю аб'яднання савецкіх, партыйных і грамадскіх устаноў далучаных тэрыторый з установамі БССР, не будуць вырашаны, ствараліся таксама часовыя: кантрольная камісія КП(б)Б, Усебеларускае бюро прафсаюзаў, Беларускае бюро ЦК РКСМ *[5, арк. 1–5]*.

Перад Асаткіным паўстала складаная задача: ад яго патрабавалася забяспечыць інтэграванне ў склад палітычнага класа БССР губернскіх эліт Віцебшчыны і Гомельшчыны, якія раней былі супраць далучэння да БССР. Хутка пытанне аб прыцягненні адказных работнікаў новых тэрыторый у цэнтральныя савецкія ўстановы Беларусі зрушылася, але з відавочнай перавагай на карысць Віцебшчыны: старшыня Віцебскага губвыканкама Зміцер Прышчэпаў стаў першым намеснікам наркама земляробства БССР, старшыня Віцебскага губернскага Савета народнай гаспадаркі Аўгуст Калнін узначаліў ВСНГ БССР, работнікі Віцебскага губкама РКП(б) Васіль Дзякаў і Васіль Трунтаеў сталі загадчыкамі адпаведна агітацыйна-прапагандысцкага і арганізацыйнага аддзелаў КП(б)Б. Рост уплыву віцебскай групы быў замацаваны на VIII з'ездзе КП(б)Б (12–14 мая 1924 года), які абраў Асаткіна адказным сакратаром ЦК КП(б)Б, а сакратарамі ЦК, фактычна яго намеснікамі, – Дзякава і Трунтаева. Прадстаўнікі Віцебшчыны атрымалі перавагу і ў складзе Цэнтральнай кантрольнай камісіі КП(б)Б, абранай на з'ездзе. Наогул «віцебскія таварышы» сталі апорай Асаткіна. Што да прадстаўнікоў Гомельшчыны, то тут можна згадаць хіба што імя Мікалая Галадзеда, які ў сакавіку 1924 года быў узяты на працу ў цэнтральны апарат КП(б)Б.

## Увага пралетарскаму складу КП(б)Б

Пільная ўвага была звернута на якасны склад Кампартыі Беларусі ў цэлым. Падчас VII з'езда (сакавік 1923 года) КП(б)Б была далёка не партыяй рабочых і сялян: больш за 50 % яе членаў былі чыноўнікамі і служачымі, а рабочыя і сяляне, занятыя выключна ў вытворчасці на прадпрыемствах або ў гаспадарках, інакш кажучы, тыя, каго ў той час называлі «рабочымі ад варштатаў» і «сялянамі ад сахі», разам складалі ў КП(б)Б каля 22 % *[6, арк. 31]*. Так званы «ленінскі прызыў», які быў аб'яўлены пасля смерці У. Леніна ў студзені 1924 года, скарэктаваў сацыяльны склад Кампартыі і павялічыў у ёй долю рабочых. А VIII з'езд КП(б)Б пастанавіў і надалей забяспечваць колькасную перавагу пралетарскага ядра ў партыі над усімі іншымі сацыяльнымі групамі, у тым ліку сялянствам, якое складала 90 % ад усяго насельніцтва рэспублікі. Праўда, гэта мера зусім не гарантавала бяспекі, і ў заключным слове на з'ездзе Асаткіну прыйшлося тлумачыць, што ж рабіць з тымі рабочымі, якія «імкнуцца сысці ад варштата і ўхапіцца за партфель» *[7, арк. 94]*.

**Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б). Аляксандр Асаткін сядзіць чацвёрты справа. 1924 год**



Былі яшчэ дзве катэгорыі членаў партыі, якія хвалявалі Асаткіна. Гэта «інтэлігенцыя наогул» і «іншыя». Было вырашана выстаўляць да іх павышаныя патрабаванні адносна палітычнай падрыхтаванасці і нават прызнана магчымым наогул прыпыніць на нейкі час іх прыём у партыю. У дакладзе на VIII з'ездзе прадстаўніка Кантрольнай камісіі КП(б)Б Роберта Вендэ (дарэчы, віцябляніна) быў прапанаваны і яшчэ адзін захад, які дазволіў бы скарэктаваць сацыяльны склад партыі: не выключаць з яе шараговых членаў з ліку рабочых і сялян, а звярнуць увагу на выключэнне адказных работнікаў непралетарскага паходжання. Вендэ прапаноўваў так: «Трэба… змяніць характар рэпрэсій у бок адказных работнікаў» *[7, арк. 58]*. Былі прыведзены і лічбы: з усіх камуністаў, прыцягнутых да партыйнай адказнасці, за апошні час з партыі выключылі 14 % адказных работнікаў і 37 % шараговых. Калі выключэнне з партыі будзе працягвацца такімі тэмпамі, перасцерагаў выступоўца, хутка ў КП(б)Б зусім не застанецца шараговых членаў.

Неўзабаве прапанову ажыццявілі: з чэрвеня па верасень 1924 года ў БССР праводзілася праверка партыйных ячэек дзяржаўных устаноў і ВНУ, мэтай якой было пазбавіцца ад чужацкіх элементаў і баласту. Аднак праверка атрымала рэзананс, на які яе натхніцелі не разлічвалі. Асаткіну гэта каштавала кар'еры ў БССР.

## Канфлікт з беларускімі кіраўнікамі

Праверка партыйных ячэек дзяржапарата і вышэйшых навучальных устаноў, ці, інакш кажучы, непралетарскага складу КП(б)Б, закранула каля 200 арганізацый і мела вынікам выключэнне з партыі больш за 500 чалавек. З іх 156, або 30 %, былі беларусамі па нацыянальнасці *[8, арк. 198]*.

Вынікі чысткі выклікалі абурэнне нацыянальна арыентаванай часткі ў кіраўніцтве БССР і КП(б)Б, відавочным лідарам якой з'яўляўся старшыня ЦВК БССР і член Бюро ЦК КП(б)Б Аляксандр Чарвякоў. У ліку выключаных апынуліся асобы, імёны якіх асацыіраваліся з поспехамі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР: былы старшыня першага ўрада Савецкай Беларусі Зміцер Жылуновіч, намеснік народнага камісара асветы Антон Баліцкі і намеснік наркама земляробства Аляксей Хатэнка. Жылуновіч быў выключаны з партыі «за адарванасць ад мас і абывацельскую псіхалогію» *[9, арк. 2]*, Баліцкі як «ідэалагічна чужацкі элемент, які не

пераварыўся за час знаходжання ў партыі, за бюракратызм і адарванасць ад партыйнага жыцця» *[10, арк. 24]*, Хатэнка – «за некамуністычныя ўчынкі» *[11, арк. 2]*. Пытанне аб іх выключэнні з партыі вельмі хутка дайшло да цэнтра, і пакуль усе трое абскарджвалі рашэнні праверачных камісій, Асаткін з Масквы атрымаў тэлеграму ад І. Сталіна: «Даведаўся, што вычышчаюць з партыі Жылуновіча, Баліцкага і некаторых нам[еснікаў] наркамаў беларусаў. Лічачы гэты крок згубнай памылкай, вельмі прасіў бы прыняць меры да прадухілення гэтай памылкі…» *[12, арк. 102–104]*.

У тэлеграмы былі яшчэ два адрасаты – Чарвякоў і старшыня СНК БССР Язэп Адамовіч. Але Асаткін не стаў паказваць ім дакумент, толькі вусна перадаў яго змест і зрабіў гэта не адразу, а пасля таго, як Чарвякоў у Маскве паспеў пабачыцца са Сталіным і ад яго даведацца пра існаванне тэлеграмы: «Калі я быў у Маскве, тав. Сталін спытаў, ці атрымаў я гэтую тэлеграму, я адказаў, што не» *[13, арк. 78]*. Інцыдэнт стаў прадметам разгляду з боку Цэнтральнай кантрольнай камісіі (ЦКК) РКП(б) у сакавіку 1925 года: Асаткін быў абвінавачаны ва ўтойванні дакумента, але, улічваючы прызнанне ім сваёй памылкі, ЦКК пастанавіла лічыць справу вычарпанай.

Тым часам Чарвякоў ініцыяваў разгляд у ЦКК РКП(б) усёй справы аб праверцы. З гэтай нагоды 6 верасня 1924 года Асаткін, старшыня ЦКК КП(б)Б Вацлаў Грузель і былы наркам земляробства, член ЦКК КП(б)Б Адам Славінскі былі запрошаны на пасяджэнне Прэзідыума ЦКК у Маскву. У сваёй прамове Чарвякоў не знайшоў добрых слоў на адрас Асаткіна і заявіў, што з палітычнага боку праверка была зусім не падрыхтавана, а яго, Чарвякова, спробы паставіць на абмеркаванне ў Бюро ЦК пытанне аб ёй не былі пачуты і ігнараваліся Асаткіным раз за разам. Чарвякоў звярнуў увагу, што падчас праверкі зусім не быў улічаны шэраг асаблівасцей, уласцівых КП(б)Б, напрыклад, тое, што ў Кампартыі Беларусі шмат выхадцаў з іншых партый: «У Беларускай арганізацыі вы знойдзеце мала такіх таварышаў, якія не мелі б адносін у мінулым да той ці іншай нацыянальнай партыі альбо арганізацыі. Па-першае, беларускія таварышы звязаны ў мінулым альбо з Беларускай Грамадой, альбо з Беларускай Камуністычнай Арганізацыяй. Па-другое, яўрэйскія таварышы, якія жывуць на радзіме Бунда, з'яўляюцца ў значнай колькасці выхадцамі з Бундаўскай арганізацыі, альбо звязаны з іншымі яўрэйскімі партыямі. Па-трэцяе, польскія таварышы звязаны ў мінулым з польскімі нацыянальнымі партыямі і арганізацыямі. Такім чынам у пытанні аб выхадцах у Беларусі павінен быць асаблівы падыход» *[8, арк. 213]*.

Сапраўды, у беларускай партыйнай арганізацыі назіраўся найбольшы паказчык выхадцаў з іншых партый. Гэта былі былыя бундаўцы, паалейцыяністы, пэпээсаўцы, правыя і левыя эсэры, меншавікі, анархісты і інш. Выхадцамі з іншых партый былі 19,28 % дэлегатаў VIII з'езда КП(б)Б *[7, арк. 197]*. Больш за ўсё іх было ў кіраўніцтве самой партыі: на канец 1925 года на цэнтральным узроўні – больш за 40 %, на акруговым – 25 % *[14, арк. 36]*. Як былы сябар Беларускай сацыялістычнай грамады, А. Чарвякоў меў падставы і сябе залічаць да гэтай катэгорыі.

Яшчэ больш Чарвякова ўразілі адносіны праверачных камісій да камуністаў-беларусаў. Старшыня ЦВК канстатаваў: «Чыстка праходзіла пад такім уражаннем сярод беларускіх работнікаў, што гэтая чыстка створана і праводзіцца з пункту гледжання разгрому і расправы з беларускімі работнікамі» *[8, арк. 216]*. У якасці прыкладаў Чарвякоў назваў выключэнне з партыі Жылуновіча, Баліцкага і Хатэнкі. Усім траім ён даў станоўчыя характарыстыкі, а з імем Жылуновіча наогул звязаў цэлую эпоху ў рэвалюцыйным руху Беларусі.

Падтрымаў Чарвякова і А. Славінскі, які таксама падкрэсліў, што чыстка прыняла адмоўныя рысы і падчас яе назіралася акрэсленая перадузятасць да беларусаў. «…Былі выключаны шэраг беларусаў, якія з майго пункту гледжання з'яўляюцца палітычнымі тварамі ў беларускай партарганізацыі і ў нашай арганізацыі адыгрываюць выключную ролю, – сказаў Славінскі. – Гэта тры самых значных работніка: Жылуновіч, Баліцкі і Хатэнка. Гэта асобы, якія па самой дзейнасці з'яўляюцца выдатнымі. Іх выключэнне з партыі ўносіць дэзарганізацыю ў нацыянальную палітыку, і тут мы атрымліваем зусім незразумелы выклік партыі. Тут мы атрымліваем самы непа-

жаданы ўхіл нашай нацыянальнай палітыкі…» *[8, арк. 180–181]*. Адказнасць за хібы чысткі Славінскі ўсклаў на Бюро ЦК і часткова на ЦКК КП(б)Б.

Са свайго боку Асаткін і Грузель спрабавалі пераканаць Прэзідыум ЦКК РКП(б) у тым, што недахопы ў чыстцы не маглі паўплываць на агульны станоўчы вынік для партыі. Грузель нават заўважыў, што калі партыйная маса даведалася пра чыстку, дык у крамах раскупілі ўсе падручнікі палітасветы. Гэты прыклад быў варты таго, каб пакпіць з яго, але Чарвякоў парыраваў сур’ёзна: «Урэшце ў крамах не стала хапаць не толькі падручнікаў палітасветы, але і палітычных слоўнікаў, бо чыстка пераўтваралася… у прадузяты экзамен, бо ў час чысткі некаторых таварышаў экзаменавалі па слоўніку, патрабуючы адказу на пытанні: што такое мануфактура? і інш. Такія факты паказваюць, што падчас чысткі былі адхіленні хваравітыя, шкодныя і не патрэбныя» *[8, арк. 223]*.

Сапраўды, пытанні, якія задавалі Жылуновічу і Баліцкаму, быццам былі ўзяты са старонак падручніка або слоўніка: у чым розніца паміж бальшавікамі і меншавікамі? хто такія ліквідатары? што такое грошы? што такое камунізм? хто такія марксісты? хто такія ленінцы? калі развалiўся II Інтэрнацыянал? чым быў выкліканы Кранштацкі мяцеж? колькі гадоў існуе партыя? у чым асновы ленінізму? што такое дыктатура пралетарыяту? І г. д. *[9–10]*.



**«Мои мысли». Аўтограф А. Асаткіна з рэмаркамі невядомага. 1924 год**

## Чарвякоў супраць Асаткіна

Нарэшце на пасяджэнні Прэзідыума ЦКК 6 верасня 1924 года Чарвякоў адкрыта выступіў супраць Асаткіна. Ён абвінаваціў яго ў хлусне, калі той пачаў сцвярджаць, быццам, ніхто ў кіраўніцтве КП(б)Б не спрабаваў узнімаць пытанні аб ненармальнасцях у чыстцы. Абвінаваціў Асаткіна ў выкарыстанні пасады адказнага сакратара для ўмяшання ў дзейнасць праверачных камісій і Парткалегіі ЦКК, у аддачы непасрэднага распараджэння выключыць з партыі А. Баліцкага (пра гэта Чарвякову, не маючы жадання падставіць Асаткіна, паведаміў Васіль Шаранговіч – старшыня праверачнай камісіі партыйнай ячэйкі Наркамасветы, з якой вычысцілі Баліцкага), у грубых паводзінах, запалохванні і нават шантажыраванні выключэннем з партыі.

Каб не быць галаслоўным, Чарвякоў прывёў прыклад з выключэннем з партыі намесніка наркама фінансаў БССР А. Любімава. Асаткіну не спадабалася, што Любімаў на запыт старшыні ЦКК Грузеля перадаў яму звесткі аб фінансавых выдатках Бюро ЦК. Асаткін зладзіў Любімаву жорсткі наганяй. «Увогуле Любімаў мне перадаваў, што ніхто ў жыцці з ім так не абыходзіўся і што ён не дапускаў магчымасці такіх адносін да партыйнага таварыша, – распавядаў Чарвякоў на пасяджэнні ЦКК РКП(б). – Калі Любімаў сыходзіў, яму было загадана пра ўсё гэта маўчаць пад пагрозай выключэння з партыі. Пасля гэтага ён прайшоў праз чыстку і быў выключаны. Любімаў упэўнены, што гэта было адным з матываў выключэння яго з партыі. Ва ўсялякім разе іншых матываў для выключэння не магло быць» *[8, арк. 221–222]*.

Што Чарвякоў меў рацыю, пацвердзіла і спецыяльна створаная ЦКК РКП(б) камісія, якая разглядала апеляцыі выключаных з КП(б)Б камуністаў. У дакладзе камісіі паведамлялася, што справы «кшталту Любімава разбіраліся па даручэнню Асаткіна і Асаткін трапіў у непрыгожую гісторыю» *[8, арк. 201]*. Не абмінула ўвагі камісіі і важная

дэталь, якая сведчыла пра барацьбу ўнутры палітычнай эліты БССР. «…Усе віцебскія работнікі трымаюць арыентацыю на Асаткіна, а беларускія работнікі на Чарвякова», – падкрэслівалася ў справаздачы камісіі *[8, арк. 202]*. Камісія таксама канстатавала, што старшыня ЦКК КП(б)Б В. Грузель, які не адносіўся да віцебскай групы, фактычна не меў магчымасці ўздзейнічаць на большасць членаў ЦКК, настрой якіх «быў такі, каб усіх выключаць». Агульныя высновы камісіі былі такія, што «праверка была абсалютна нікуды не вартая», стварыла ў Кампартыі Беларусі склоку, што ЦКК КП(б)Б «абсалютна не рэагавала на выключэнне беларусаў, якія займалі значныя пасады», і наогул хуткасць чысткі стварыла ўражанне, што яна была накіравана супраць непажаданых Асаткіну і яго прыхільнікам асоб. «Такое склалася ўражанне ў таварышаў беларусаў, якія займалі адказныя пасады ў Беларускай арганізацыі», – удакладнялася ў справаздачы *[8, арк. 202]*.

У спрэчцы паміж Асаткіным з аднаго боку і Чарвяковым з другога Прэзідыум ЦКК РКП(б) цалкам, без адзінай агаворкі, стаў на бок Чарвякова. У нацыянальнай палітыцы партыя якраз станавілася на шлях прыцягнення да кіраўніцтва саюзнымі рэспублікамі мясцовых нацыянальных кадраў, каранізацыі, падтрымкі развіцця нацыянальных культур і г. д. Менавіта гэтымі палітычнымі рашэннямі, якія не ўлічыў Асаткін, можна растлумачыць, чаму ў гэтым канфлікце цэнтр не падтрымаў яго. А 6 верасня 1924 года Прэзідыум ЦКК вынес пастанову аб тым, што падчас чысткі былі здзейснены памылкі, якія сведчаць пра недастатковы ўлік ЦК і ЦКК КП(б)Б нацыянальных момантаў, неабходнасць «вельмі беражлівых адносін да камуністаў-нацыяналаў, якія з'яўляюцца папулярнымі сярод беларускіх мас і звязваюць партыю з сялянамі і рабочымі Беларусі» *[8, арк. 207–207 адв]*. На працягу верасня Жылуновіч, Баліцкі і Хатэнка былі адноўлены ў партыі.

## Развітальны пленум

А для Асаткіна верасень 1924 года стаў апошнім месяцам знаходжання ў БССР – Аргбюро ЦК РКП(б) вырашыла паставіць кропку ў яго «беларускай» кар'еры. Скліканы на 27–29 верасня 1924 года аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з удзелам сакратароў акруговых камітэтаў партыі стаў для Асаткіна развітальным. Большасць удзельнікаў Пленума былі на яго баку, але вымушаны былі прыняць да ведама рашэнне Аргбюро аб яго адкліканні з БССР. Пад канец, аднак, Асаткін скарыстаўся падтрымкай прысутных. Удзельнікі Пленума заслухалі даклад «Аб выніках праверкі непралетарскага складу партыйных арганізацый Беларусі», а пасля прынялі пастанову аб тым, што праверка была добра падрыхтавана, праводзілася ўдумліва, свядома, вытрымана і што праверачныя камісіі ўважліва паставіліся да ўсіх, каго правяралі і прадэманстравалі «чыста таварыскі падыход» *[15, арк. 5]*.

Закрытае пасяджэнне Пленума адбылося 29 верасня – каб «паставіць на від» і «заклікаць да парадку» Чарвякова і Славінскага і прызнаць іх прамовы ў ЦКК РКП(б) тэндэнцыйнымі *[16, арк. 1]*. З 33 удзельнікаў за гэта рашэнне было пададзена 23 галасы, у тым ліку «за» прагаласавалі ўсе прадстаўнікі далучанай да БССР Віцебшчыны (Прышчэпаў, Калнін, Дзякаў, Трунтаеў, Вендэ, Нейланд і інш.), супраць – 10. Але Чарвякоў ізноў не стаў маўчаць і далучыў да пратакола асобнае меркаванне: «Лічу, што маё выступленне ў Прэзідыуме ЦКК ні ў якім разе не было тэндэнцыйным. …Рашэнне Пленума ЦК вынесена без уважлівага вывучэння выкладзеных мной фактаў, а таму я застаюся пры асобным меркаванні, пра што і даводжу да ведама ЦКК РКП(б)» *[16, арк. 1]*.

Прэзідыум ЦКК РКП(б) ізноў цалкам падтрымаў Чарвякова: рашэнне Пленума 29 верасня было прызнана няправільным, а «пастаноўка на від» яму і Славінскаму адменена. ЦКК канстатаваў, што ніякай тэндэнцыйнасці ў выступленнях Чарвякова і Славінскага не было, бо ЦКК накіроўвала адмысловую камісію ў Мінск, якая разбірала справу на месцы і «пацвердзіла правільнасць падыходу тт. Чарвякова і Славінскага», а таму «заклік да парадку» на іх адрас не адпавядае ні фактам, ні паняццю аб партыйнай дысцыпліне і пастанова аб'яднанага Пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б «зусім няправільная» *[16, арк. 9]*.

## Пасля БССР

Пасля адклікання з БССР Асаткіна прызначылі намеснікам загадчыка Арганізацыйна-размеркавальнага аддзела ЦК РКП(б), але хутка накіравалі ў г. Уладзімір на пасаду адказнага сакратара Уладзімірскага губкама РКП(б). У 1928 годзе ён стаў старшынёй праўлення Усесаюзнага Сельскагаспадарчага банка, а ў сакавіку 1930 года быў накіраваны ў Хабараўск у якасці старшыні краявога выканаўчага камітэта. У 1931–1932 гадах лёс пасунуў Асаткіна яшчэ далей на Усход – два гады ён быў гандлёвым прадстаўніком СССР у Японіі. Пасля вызвалення ад гэтых абавязкаў Асаткіна накіравалі на Украіну: з 1933 па 1935 год працаваў начальнікам палітсектара машынна-трактарных станцый пры наркамземе УССР, у сакавіку 1935-га стаў начальнікам Упраўлення народнагаспадарчага ўліку СНК УССР, пасля дырэктарам Інстытута эканомікі Акадэміі навук УССР. На пленуме ЦК КП(б)У, які адбыўся 3–4 ліпеня 1937 года, А. Асаткіна выключылі з партыі, на наступны дзень арыштавалі. Ён быў расстраляны ў ноч на 2 верасня 1937 года. У 1957 годзе А. Асаткіна рэабілітавалі пасмяротна.

***Выкарыстаны ілюстрацыйныя матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага цэнтральнага музея сучаснай гісторыі Расіі***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.02.2024 г.*

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). – Ф. 533. Воп. 2. Спр. 74.
2. Из истории образования СССР // Известия ЦК КПСС. – 1989. – № 9. – С. 191–218.
3. Государственные границы Беларуси: сб. документов и материалов: в 2 т. / сост.: В.Е. Снапковский [и др.]. – Минск: БГУ, 2012. – Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926). – 495 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1260.
5. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1272.
6. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1007.
7. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1252.
8. ДАРФ. – Ф. Р374. Воп. 27. Спр. 386.
9. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 1. Спр. 5692.
10. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 1. Спр. 214.
11. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 1. Спр. 5058.
12. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. – Ф. 558. Воп. 11. Спр. 32.
13. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 777.
14. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1982.
15. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1266.
16. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1268.